**Картка № 1**

***1.Замяніце дзеясловы дзеепрыметнікамі залежнага стану і ўтварыце словазлучэнні***

Прынесці (вада), сабраць (ураджай), расказаць (верш), пабудаваць (хата), пражыць (год), зламаць (галінку), асушыць (балота), паліць (кветкі).

***2.Знайдзіце няправільна ўтвораныя і запісаныя дзеепрыметнікі. Выпраўце памылкі, запішыце правільны варыянт.***

Адпушчаныя сродкі, прыклеяная афіша, пражыты век, паселіныя ў новыя дамы, апісаннае падарожжа, занесеныя ветрам, паднятая крышка, накормляныя дзеці, пастаўленыя ў рад, пералічэнныя асаблівасці, акуратна прычасаны, знясіліныя ў барацьбе.

***3. Заданне "Знайдзі лішняе".***

1. Пажаўцелая, зарослыя, прыбраны, збялелы.
2. Ацалелы, шэпчацца, куплены, пасеяны.
3. Размясціў, адкрытых, заснаваных, вывучаных.
4.З'едзены, упрыгожаны, прынесены, пачырванелая.

***4. Заданне. Замяніце другую частку сказа дзеепрыметнікамі.***

1. Не купіш таго дня, які страціў.
2. Перацягне лёгкі рубель тая капейка, якую набылі мазалём.

**Картка № 2**

*Прачытайце тэкст. Вызначце стыль і тып маўлення. Знайдзіце і вызначце дзеепрыметнікі, вызначце суфіксы.*

**Крыж Ефрасінні Полацкай**

У 1162 годзе полацкі ювелір Лазар Богша стварыў па заказе Ефрасінні Полацкай крыж. Крыж шасціканцовы, даўжынёй 51 сантыметр, аснова драўляная. На пярэдняй і адваротнай плоскасцях прымацаваны 11 залатых пласцін, аздобленых перагародчатымі каляровымі эмалямі з выявамі святых, арнаментальнымі кампазіцыямі, каштоўнымі камянямі. Бакі крыжа абкладзены сярэбранымі пазалочанымі пласцінамі. На іх прасечаны надпіс, у якім паведамляецца гісторыя стварэння рэліквіі, дата, імя майстра. Да 1941 года крыж захоўваўся ў Магілёўскім краязнаўчым музеі. У час вайны крыж быў вывезены акупантамі, месца яго знаходжання сёння невядома.